■ Ад шчырага сэрца

# УСЕ НА ЛЁД!

**Святочным мерапрыемствам у Лядовым палацы пачаўся ў сталіцы дабрачынны марафон Беларускага дзіцячага фонду**







Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**27-ю РЭСПУБЛІКАНСКУЮ дабрачынную акцыю «Нашы сэрцы — дзецям», якая праходзіць у межах агульнарэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», падтрымалі сёлета дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву па фігурным катанні на каньках і валанцёрскі клуб Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «СЛОН».**

Свята для дзяцей-сірот, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, праходзіла на каньках. На лёд выйшаў і сам Дзед Мароз. Забаўляльная праграма прадугледжвала конкурсы і гульні, выступленні выхаванцаў школы алімпійскага рэзерву па фігурным катанні, навагоднее лядовае прадстаўленне, майстар-класы ад юных фігурыстаў і трэнераў, масавае катанне для ўсіх гасцей. Завяршылася ўсё ўручэннем навагодніх падарункаў.

22 снежня дзіцячы фонд плануе падарыць навагодняе свята пацыентам дзіцячага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя, 26 снежня — дзіцячага апёкавага аддзялення Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, 27 снежня — дзіцячага траўматалагічнага аддзялення 6-й гарадской клінічнай бальніцы, 28 снежня — Рэспубліканскага дзіцячага кардыялагічнага цэнтра. Акцыя «Нашы сэрцы — дзецям» пройдзе ва ўсіх рэгіёнах.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

*(Больш фота — на сайце «Звязды».)*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

**Клаўдзія ЛІТВІНЧУК, настаўніца-пенсіянерка з вёскі Тэльмы Кобрынскага раёна:**

## Калі пачытала, дык і палюбіла

— Газету пачала чытаць маладой настаўніцай. Сёлета наш выпуск адзначыў 50-годдзе з дня заканчэння інстытута, значыць, і выпісваю я выданне больш за 40 гадоў. А зрабіць выбар на карысць газеты на роднай мове дапамог выпадак. Ведаеце, як бывае ў вясковай школе, калі не хапае спецыялістаў: любы настаўнік і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц. Так і мне, географу і біёлагу, аднойчы давялося выкладаць родную мову і літаратуру ў чацвёртым класе. Ну і выпісала тады беларускую газету, каб больш практыкавацца. А калі пачытала, дык і палюбіла. Як аказалася, назаўсёды.

У маладосці, у студэнцкія гады, мне пашчасціла шмат вандраваць па Савецкім Саюзе, аб'ехала таксама ўсю Беларусь. Таму люблю матэрыялы краязнаўчага характару. Вось нядаўна прачытала, што адкрыўся для наведвальнікаў Косаўскі палац. З дачкой пагаварылі, прыйшлі да высновы, што летам добра было б з'ездзіць... Чытаю наогул усё. Асабліва люблю аўтарскія калонкі. З цікавасцю прачытваю ўсё, што датычыцца Брэсцкага рэгіёна. Удзячная за тое, што і з нашай вёскі ў апошні час на старонках было некалькі матэрыялаў. Мы іх чытаем разам з сяброўкамі-суседкамі, захоўваем выразкі.

Дзякуй за тое, што газета шмат піша пра людзей, што даязджаеце ў самыя аддаленыя вёскі. Жадаю, каб і другое стагоддзе любімая газета заставалася такой жа людскай і цікавай.

■ Будзе свята!

## На кірмашы — па водар хвоі

**Праўда, на навагоднія святы ўсё часцей замест ляснога дрэўца сталі выбіраць штучныя ялінкі.**

— З 2015 года аб'ёмы продажу натуральных елак памяншаюцца, у 2016 годзе іх удалося рэалізаваць каля 140 тысяч. Акрамя звыклых ссечаных дрэў карыстаюцца папулярнасцю букеты з галінак і жывыя расліны ў кадках. Так, за 2015 год грамадзяне набылі каля 600 жывых елак, а ў 2016 годзе гэтая лічба павялічылася да 900, — паведаміў **начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр СУРТА.**

Сёлета да рэалізацыі падрыхтавана каля 180 тысяч навагодніх дрэў, яны трапяць у продаж з 22 снежня. Магчыма, што ў некаторых абласных гарадах гандаль пачнецца нават раней — асобныя арганізацыі, юрыдычныя асобы ўжо зацікаўлены, каб набыць ялінку да свята раней. Усяго па краіне запланавана 1100—1150 гандлёвых пунктаў, прычым па 20—25 з іх з'явіцца ў абласных гарадах.

**Аляксандр УГРЫН, кансультант упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі,** папярэдзіў пра ўзмоцнены рэжым аховы лясоў, які дзяржаўная лясная ахова распачне з 18 снежня. У спецыяльных рэйдах прымуць удзел супрацоўнікі МУС, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншыя зацікаўленыя ўстановы. Таксама лясная ахова выставіць на дарогах агульнага карыстання пасты, якія стануць правяраць наяўнасць дакументаў на дазвол правозу навагодніх дрэў. Акрамя таго, у сістэме адсочвання сёння выкарыстоўваецца 526 фотапастак, з пачатку года з іх дапамогай да адказнасці былі прыцягнуты 283 парушальнікі.

— Хацелася б адзначыць, што, у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, за незаконную высечку дрэў прадугледжваецца адказнасць у выглядзе штрафу ад 5 да 50 базавых велічынь, — нагадаў Аляксандр Угрын.

Дарэчы, кошт ялінкі вышынёй ад 1 да 2 метраў сёлета вагаецца на ўзроўні 9—15 рублёў у залежнасці ад вышыні дрэўца і рэгіёна яго рэалізацыі. Як і заўсёды, танней набыць навагодняе дрэва можна будзе адразу ў лясніцтве.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Вакзал для... аркестра

**Адбудзецца ён 20 снежня. Сумесны музычны праект БЧ і Прэзідэнцкага аркестра пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі Віктара Бабарыкіна праводзіцца на вакзале станцыі Мінск-Пасажырскі ўпершыню і прымеркаваны да 155-годдзя Беларускай чыгункі, расказалі ў прэс-службе магістралі.**

На працягу гадзіны, з 12.40 да 13.40, у зале чакання на трэцім паверсе вакзала пасажыры, госці і жыхары сталіцы адправяцца ў музычнае падарожжа з удзелам таленавітых музыкантаў Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь — будуць гучаць сусветныя хіты і нацыянальныя мелодыі розных краін. Сімвалічна, што выступленне калектыву праходзіць у год яго 15-годдзя.

Сярод гледачоў на канцэрце таксама будуць прысутнічаць актывісты БРСМ, работнікі і ветэраны беларускай магістралі.

20 снежня на канцэрце запланавана ўшанаванне двухмільённага інтэрнэт-пасажыра, якому будуць уручаныя памятны падарунак і імянны сертыфікат, які пацвярджае гэты статус.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Небяспека

## Зімовы пералом

**Толькі за адзін зімовы дзень — у мінулую нядзелю — з галалёдны траўмай у РНПЦ траўматалогіі і артапедыі паступілі 18 чалавек, чацвёра з якіх — дзеці.**

Галалёдная траўма сама па сабе бывае рознай. Пацярпець у выніку падзення на слізкі лёд могуць і рукі, і ногі, і пазваночнік, і галава, а ў пажылых — яшчэ і шыйка бядра. Менавіта таму ўрачы нагадваюць аб важнасці мер засцярогі і самакантролю, пра што многія ўспамінаюць толькі ў лячэбнай установе. Паводле слоў **галоўнага пазаштатнага дзіцячага траўматолага-артапеда камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, загадчыка дзіцячага траўматолага-артапедычнага аддзялення 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Станіслава ТРАЦЦЯКА**, пік траўмаў у дзяцей прыпадае на лета, калі тыя больш часу застаюцца без нагляду, аднак і зімой хапае нешчаслівых здарэнняў. Не так даўно адно катанне на санках скончылася няўдалым падзеннем таты на нагу дзіцяці. У выніку — пералом. Другое дзіця пацярпела ад таго, што ў той момант, калі яно ўпала, нехта наехаў яму на кісць. Адсюль аперацыя, ды не адна.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства**

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Подразделение департамента:** Управление по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

**Уполномоченный орган:** отдел принудительного исполнения по Витебскому району г. Витебска.

**Лот №1.** Капитальное строение (одноквартирный жилой дом) с инв. №200/С-28344, общей площадью 46,6 кв. м с составными частями и принадлежностями: жилой пристройкой, сенями, уборной, расположенное на земельном участке с кадастровым номером №221280610101000737, площадью 0,2163 га, расположенное по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Ольгово, ул. Южная, 31. Начальная цена: 5 965,20 рублей. Задаток: 596,52 рублей. Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Дата, время и место проведения аукциона:** 17.01.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 18.12.2017 с 8.30 по 16.01.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, копии учредительных документов, иностранным юр. лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63.

Условие – наличие не менее 2 участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5% (Претендент на покупку). Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе предмета аукциона не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона изготавливает технический паспорт на объект за счет собственных средств. Организатор аукциона вправе снять лот с аукциона по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным. **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**



В связи с утерей **считать недействительным** свидетельство о государственной регистрации Закрытого акционерного общества «ЭКСПОСИТИ».

УНП 691299833


■ Здарэнні

## Кватэра загарэлася ад свечкі?

**На пажары па вуліцы Галадзеда ў сталіцы выратавалі пяцярых дарослых і двух дзяцей.**

Калі падраздзяленні МНС прыбылі на месца, па знешніх прыкметах нічога не назіралася. Высветлілася, што на другім паверсе пяціпавярховага жылога дома ў адной з кватэр загарэлася маёмасць у гасцінай і пакоі. Гаспадыні жылля на момант здарэння дома не было. Работнікі МНС з вышэйразмешчаных паверхаў выратавалі сем чалавек, сярод іх — двое дзяцей 2009 і 2015 гадоў нараджэння. З пад'езда эвакуіравалі яшчэ чатырох жыльцоў, у тым ліку дзіця. Прычына пажару ўстанаўліваецца. Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, версія, якая разглядаецца: пакінутая гаспадыняй кватэры без нагляду запаленая свечка. У выніку здарэння агнём пашкоджана маёмасць. Пацярпелых не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*